# МАСТАК ВАДЫ, ЗЯМЛІ І НЕБА

**«Павел Масленікаў. Партрэт мастака ў люстэрку часу» — кнігу пра народнага мастака Беларусі прэзентавалі ў Магілёўскім мастацкім музеі, які носіць яго імя.**

Аўтарам кнігі стала дачка вядомага мастака — Вера Пракапцова, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры беларускай і сусветнай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Фінансаваў выданне кнігі Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Першымі з кнігай пазнаёміліся магілёўцы. Вера Пракапцова прадставіла яе ў музеі і прывезла 300 асобнікаў для бібліятэк, музеяў і навучальных устаноў Магілёўскай вобласці. Яна расказала, што пісала кнігу 5 гадоў. У яе ўвайшлі ўспаміны пра мастака, яго жыццё. Напрыклад, раздзел «Ракурсы творчасці» прысвечаны любімым тэмам Паўла Васільевіча — вадзе, зямлі і небу. У выданні шмат архіўных фотаздымкаў і дакументаў, рэпрадукцыі работ Масленікава.




— Ён пакінуў багатую творчую спадчыну, — сказала пра бацьку Вера Пракапцова, — і лёс сваіх работ вызначыў яшчэ пры жыцці: выбраў і падарыў 125 жывапісных палотнаў роднай магілёўскай зямлі, на якой нарадзіўся.

У наступным годзе будзе адзначацца 100-годдзе з дня нараджэння Паўла Васільевіча. Як расказаў дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў, да юбілейнай даты плануецца стварыць фільм, правесці вечарыну, выпусціць спецыяльныя канверт і марку.

**Ілона ІВАНОВА.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ